**УДК 902.01+780.6+7.033(476.5-21)**

# МУЗЫЧНАЯ КУЛЬТУРА ПОЛАЦКА XI – XIX стст. (ПА МАТЭРЫЯЛАХ АРХЕАЛАГІЧНЫХ РАСКОПАК)[1]

***А.Л. КОЦ***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Старажытная музычная культура Полацка з’яўляецца недаследаванай тэмай у айчынай гістарычнай навуцы. Мэтанакіраваныя археалагічныя даследаванні ў азначанай галіне амаль што не праводзіліся, а колькасць археалагічных знаходак, якія падцвярджаюць распаўсюджанне музычных інструментаў, дастаткова вялікая. Таксама выяўлены артэфакты з малюнкамі музыкаў. Унікальнай знаходкай з’яўляецца фрагмент старажытнай цэглы (плінфы) з выявай музыкаў. Выява не толькі падае інфармацыю аб музычных інструментах, але і аб шэрагу дэталей: адзенне, абутак, кампазіцыйнае размяшчэнне і інш. Артэфакты перыяду XVI – XIX стст. таксама выяўлены ў вялікай колькасці. Найбольш частай знаходкай з’яўляюцца керамічныя свістулькі. У 2020 г. адноўленая традыцыя вырабу свістулек была ўнесена ў спіс нематэрыяльных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.*

***Ключавыя словы:*** *Полацк, археалагічныя даследаванні, музычная культура, музычны інструмент, гуслі, плінфа.*

**Уводзіны.** Сёння старажытная музычная культура – вельмі актуальная тэма для сучаснага грамадства. Вядзецца актыўная праца па вывучэнні этнаграфічных крыніц, апытанні інфармантаў і пошуку пісьмовых крыніц. Археалагічная навука ў гэтым нікірунку пасуе, бо яе задачай з’яўляецца ў першую чаргу вывучэнне матэрыяльнай культуры, а раскрыццё духоўнай культуры сягае толькі праз канкрэтны рэчавы матэрыял. Тым не менш, шэраг археалагічных знаходак удакладняе і паглыбляе нашыя веды аб духоўным складзе нашых продкаў. Асобныя археалагічныя артэфакты дазваляюць удакладніць розныя моманты, звязаныя пераважна з музычнымі інструментамі. Варта адзначыць, што гэта могуць быць і выявы (малюнкі) на археалагічных знаходках ці аб’ёмныя скульптуры. Мэтай артыкула з’яўляецца характрыстыка археалагічных знаходак, знойдзеных падчас раскопак старажытнага Полацка, якія дазваляюць характарызаваць музычную культуру горада.

У першую чаргу музычную культуру вызначаюць музычныя інструменты. Іх пераважная большасць выраблялася з дрэва. Як вядома, у Полацку дрэва вельмі дрэнна захоўваецца, нават у параўнанні з іншымі беларускімі гарадамі (Віцебск, Мінск, Навагрудак, Брэст-Берасце). Культурны пласт Полацка, які спрыяльна захоўвае драўніну і арганічныя рэчывы, сфарміраваўся на тэрыторыі Верхняга замка, Вялікага пасада і эпізадычна ў іншых асобных частках горада. Але знаходкі з дрэва, якія можна атаясамліваць з музычнымі інструментамі, нам не вядомыя, таму ў Полацку пераважная большасць музычных інструментаў, іх часткі або дэталі, зроблены з каляровых металаў, жалеза, косці або керамікі.

**Асноўная частка.** Як асобны від музычных інструментаў выступаюць бразготкі. Адны з іх маглі выкарыстоўвацца як прывескі да адзення [1, с. 67, 225], іншыя маглі ўваходзіць у камплект музычных паграмушак [13, с. 68]. Вялікага памеру шархуны маглі выкарыстоўвацца для аздаблення конскай вупражы. Адна вялікая бразготка была знойдзена падчас раскопак на тэрыторыі Ніжняга замка ў 2014 г. Яна зроблена са свінцова-алавяністага сплаву з дабаўленнем медзі і па поясе арнаментавана пяццю лініямі арнаменту, а ў ніжняй частцы нанесены рыскі. [5, с. 41]. У Полацку выяўлена вялікая колькасць бразготак, якія маглі з’яўляцца часткай касцюма або дэталямі музычнага інструмента. Можна вылучыць некалькі памераў (ад 0,5 да 1,5 см у дыяметры) з крыжападобнай або лінейнай прараззю. У нутро ўстаўляўся шарык, які пры раскалыхванні падаваў гук. Распаўсюджаны яны былі ў XI – XV стст. і выраблялiся з каляровых металаў шляхам ціснення або маглі быць літымі. Падчас даследаванняў ювелірнай майстэрні на Запалоцкім пасадзе была выяўлена пласціна з круглымі адтулінамі [11]. Можна меркаваць, што яна з’яўляецца адыходам вытворчасці: з яе высякалі круглыя пласцінкі, якія потым рабілі пукатымі і з дзвюх такіх палавінак спайвалі цэлы шарык з прараззю.

У Полацку былі выяўлены касцяныя калочкі, якія досыць умоўна можна аднесці да струнатрымальнікаў. Адзін невялікі калочак уяўляе сабой цыліндр, які зроблены ахайна, адзін канец завостраны, другі фігурна завершаны. Даўжыня артэфакта 6,2 см, дыяметр у сячэнні 0,7 см. Падобная знаходка выяўлена ў Мінску і датуецца XIV – XVIII стст. [9, с. 24]. Яшчэ адзін касцяны калочак, які Д.У. Дук вызначае як дэталь ад струннага музычнага інструмента, з’яўляецца падъёмным матэрыялам і паходзіць з даследаванняў 2006 г. на Запалоцкім пасадзе (з пляцоўкі на заходняй ўскраіне помніка). Яго даўжыня 3 см. Даследчык не падае даты дадзенага артэфакта. [4, с. 24, 40]. У заходняй частцы Запалоцкага пасада актыўная фаза жыццядзейнасці людзей прыпадае на XI – XII стст., потым забудова тут магла сфарміравацца эпізадычна, як фальваркавая. Прынамсі, яскравага культурнага пласта, які мог бы сфарміравацца пасля XII ст., тут не вызначана. Таму, з пэўнай доляй сумнення, калок можна аднесці да старажытнарускага перыяду. Пры гэтым варта заўважыць, што захаванасць вырабаў з косці, як і саміх костак жывёл, на дадзеным помніку вельмі дрэнная.

---

[1] Работа выканана ў межах Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» на 2021 – 2025 гг. (навукова-даследчыцкая праца «Гаспадарка, культурныя традыцыі і насельніцтва Полацка і Полацкага Падзвіння ў эпоху станаўлення і развіцця гістарычных форм беларускай дзяржаўнасці ў IX – XVIII стст.»).

Свісцёлкі часта выраблялiся з трубчатых костак, найперш птушыных. У Полацку выяўлены тры такія артэфакты. Адна з іх паходзіць з раскопак на Верхнім замку ў 1959 г. Даўжыня трубачкі 7,7 см пры дыяметры 1 – 1,2 см. З аднаго боку маецца пашырэнне. У верхняй частцы музычнага інструмента маецца невялікая адтуліна. Яшчэ адна знаходка з Верхняга замка вельмі тонкай работы. Тонкая трубачка даўжынёю 8,2 см пры дыяметры 0,6 см. У верхняй частцы зроблена невялікая адтуліна. Канцы трубачкі аздоблены геаметрычна-лінейным арнаментам. Падобны на свістульку музычны інструмент знойдзены на Вялікім пасадзе ў 2001 г. Даўжыня захаванай часткі 6,5 см пры дыяметра 1,7 – 1,8 см. Усе азначаныя знаходкі датуюцца XII – XIII стст. [12, с. 93–94].

Таксама, цікавая выява духавога інструмента адлюстравана на графіці Спаса-Праабражэнскага храма ў Полацку. Гэта выява дудара, якая знаходзіцца на паўднёвай сцяне ахвярніка, справа ад ўвахода ў алтар [8, с. 149, 267]. Абрысы чалавека прадрапаны ўмоўна, пазначэнне ног адсутнічае. У роце ён трымае ражок, які верагодна прызначаўся для падачы гука. Дакладны кантэкст дадзенай выявы не вызначаны. Магчыма, ён прымеркаваны да святкавання Купалля, бо выява нанесена паверх надпіса пра Купальны тыдзень. Выява музыкі не мае дакладнай датыроўкі[2]. Падчас раскопак паўночнай галерэі Спаса-Праабражэнскага храма ў 2020 г. было знойдзена два фрагменты адной плінфы (старажытнай цэглы) з выявай двух музыкаў на пастэлі (малюнак). Малюнак зроблены па сырой гліне, т.е. калі яна была ўкладзена ў форму, але яшчэ не паспела высахнуць. Дадзеныя два фрагменты паміж сабою маюць памежны палом і таму выяву двух чалавек можна рэканструяваць у адну кампазіцыю.



**Малюнак. – Рэканструкцыя памераў плінфы з выявай музыкаў**

У старажытнарускі перыяд храмы будавалі з тонкай цэглы і ў навуцы яна атрымала назву плінфа. Плінфа, якая выкарыстоўвалася пры будаўніцтве Спаса-Праабражэнскага храма ў сярэднім мае памер 27,5 – 29,5 × 22,5 – 24,5 × 3 – 4 см. Для вырабу плінфы выкарытоўвалі раз'ёмную і нераз'ёмную формы. У Полацку на ўсіх помніках XI-XII стст. зафіксавана выкарыстанне раз'ёмнай формы. Гэта значыць, што дошкі ад формы раздымаліся на бакі. У такім выпадку на бакавых паверхнях фіксуюцца рэльефныя знакі і закраіны. Пастэль (верхняя паверхня) загладжвалася дошкай. У форме плінфа падсыхала, а потым яе вымалі і дасушвалі на адкрытым паветры. Відавочна, калі плінфа была яшчэ не высахшай, то на яе пастэль быў нанесены малюнак музыкаў. З малюнкам яна дасохла і патрапіла ў печ для абпалу, а потым – у кладку сцяны паўночнай галерэі. Пасля разбурэння галерэй, фрагменты дадзенай плінфы патрапілі ў слой будаўнічага смецца і ўжо адтуль былі выяўлены падчас археалагічных раскопак.

Традыцыя наносіць розныя малюнкі па вільготнай гліне плінфы была шырока распаўсюджанай. Археалагічныя і архітэктурныя даследаванни паказваюць, што гэта вельмі прыдатны матэрыял і яго актыўна выкарыстоўвалі для пісьма ці малявання на будаўнічай пляцоўцы. Так, падчас раскопак Спаса-Праабражэнскай царквы

[2] Выказваю шчырую падзяку кандыдату гістарычных навук, дацэнту кафедры агульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі БДПУ імя М. Танка І.Л. Калечыц за прадастаўленую інфармацыю.

выяўлена плінфа, разлінаваная накшталт табліцы. Магчыма, гэта часовая дошка для настольнай гульні. Цікавая выява фрагмента пояса ў выглядзе пляцёнкі (абедзве знаходкі 2017 г.). Сустракаюцца розныя фрагменты ліній, нанесеных па сырой гліне [6]. Самай унікальнай знаходкай з'яўляецца фрагмент плінфы з чарцяжом храма-пахавальні на тэрыторыі Спаса-Еўфрасіньеўскага манастыра (знаходка 2017 г.) [6]. Плінфа з выявай музыкаў таксама адносіцца да катэгорыі ўнікальным артэфактаў.

Малюнак зроблены схематычна, з рэалістычнай прамалёўкай дэталей. Абодва музыкі на ўзроўні жывата трымаюць струнныя інструменты. Аналіз і пошук аналогій дазволілі папярэдне вызначыць, што гэта маглі быць гуслі, якія не маюць іграцога вакна. На правай выяве зафіксавана, што чалавек трымае інструмент левай рукой. Па левай выяве можна вызначыць, што чалавек іграе на інструменце правай рукой, а, магчыма, і дзвюма рукамі. У такім выпадку гуслі маглі падвешвацца поясам на плечы ці шыю. У музычным інструменце музыкі з правага боку налічваецца 6 струн. У левага – не больш трох. Такая розніца ў колькасці струн, асабліва ў левага музыкі, можа тлумачыцца іх схематычным пазначэннем. На наш погляд, адметнымі з'яўляюцца канцы музычных інструментаў. Відавочна, што яны маюць паўкруглае завяршэнне, што надае прадмету пэўную форму.

Дадзеная выява дазваляе рэканструяваць элементы адзення старажытнарускага перыяду. У аднаго з музыкаў на галаве апранута шапачка, кшталту калпачка. Верагодней за ўсё, што падобны галаўны ўбор характэрны для прадстаўнікоў забаўляльнай культуры – скамарохаў. Такім чынам і ўвесь касцюм папярэдне можна характарызаваць як касцюм скамароха. Адпаведным чынам афармлена адзенне, якое пакрывае плечы аднаго чалавечка. Вялікую цікавасць выклікаюць кропкі, якія пастаўлены ў розных частках на целе музыкаў і на музычных інструментах. Вызначыць іх прызначэнне, пакуль што, немагчыма.

Распаўсюджанасць гусляў на тэрыторыі Усходняй Еўропы грунтоўна даследавала Ф.Д. Гурэвіч. У старажытнарускім і заходнееўрапейскім мастацтве выявы музыкаў з вертыкальнапастаўленым струнным інструментам, часцей прамакутнай ці трапецыяпадобнай формы, шырока распаўсюджаны. [2, с. 278–280]. А вось выявы музыкаў з інструментам, пакладзеным гарызантальна, адзіночныя. Апошнія знойдзены на пласцінкавых бранзалетах з Кіеўскага і Старарязанскага скарбаў. У адным варыянце абодва датуюцца XII – XIII стст. [13, с. 72], у другім – XIII ст., але дакладнага вызначэння няма. Большасць даследчыкаў схільны меркаваць, што гэта шчыпковыя гуслі. Паветкін пазначае, што гуслі без іграцога вакна вядомы на Русі з XII ст. [13, с. 72]. Таксама, падчас раскопак старажытнага Гданьска, у пласце XII ст. была знойдзена дошка ад пяціструнных гусляў без іграцога вакна [19, с. 102–104]. Полацкую знаходку можна датаваць першай паловай – сярэдзінай XII ст. Відавочна, што выраб плінфы з'яўляецца часткай будаўнічага працэсу Спаскага храма. Існуе дзве версіі ўзвядзення царквы: адна вызначае перыяд будаўніцтва ў межах канца 1120 – 1130-х гг. [18], другая прыпадае на 1150-я – 1161 г. [16]. Гэтым жа перыядам мы можам прадатаваць і выяву музыкаў. Такім чынам, на аснове полацкай знаходкі мы маем схільнасць да больш старажытнай датыроўкі з'яўлення гусляў без іграцога вакна на тэрыторыі Усходняй Еўропы: першая палова – сярэдзіна XII ст.

Таксама, ў Полацку знойдзена не менш 5 варганаў. Яны выраблялiся з жалеза ў форме падкоўкі з падоўжанымі прамымі канцамі і спружынным язычком паміж імі. Знаходкі лакалізуюцца ў розных частках горада: адзін паходзіць з раскопак С.В. Тарасава на плошчы Свабоды і датуецца XIV – XV стст. [3]. Варган без язычка быў выяўлены ў 2002 г. падчас раскопак Д.У. Дука на плошчы Свабоды (па тэрыторыі былога езуіцкага калегіўма) і прадатаваны XV – XVII стст. [3]. Яшчэ адзін быў знойдзены падчас раскопак на Стрэлцы Ніжняга замка ў 2014 г. і датаваны XV – XVII стст. Прадмет моцнакаразіраваны, без язычка [5]. Чацвёртая знаходка варгана паходзіць з раскопак аўтара на тэрыторыі Запалоцкага пасада ў 2015 г., датуецца XV – XVII стст. Артэфакт моцна пашкоджаны карозіяй і мае страты [10]. Пятая знаходка лакалізавана ў межах Полацка, але дакладнай інфармацыі не стае.

Агульная колькацыя керамічных свістулек, выяўленых у Полацку, перавышае 100 адзінак. Усе яны знойдзены ў розных частках горада: на Вялікім пасадзе, у Запалоцці, на Задзвінскіх пасадах (найперш Экіманьскім), на тэрыторыі былога езуіцкага калегіўма. Даследаванням дзіцячых цацак, у першую чаргу, свістулек прысвечаны асобны артыкул А.А. Салаўёва [14, с. 50]. Найбольш шырокараспаўсюджанымі вобразамі з'яўляецца свістулька-«конік» у двух варыянтах: са спаранымі пярэднімі нагамі і на расстаўленых нагах з выцягнутай дугой шыяй. Як правіла, па баках коніка рабілі адну ці дзве адтуліны. Унікальнай знаходкай з'яўляецца так званая свістулька-гаршчок «салавей», якая датуецца XVII – XIX стст., выяўленая на Верхнім замку і зараз захоўваецца ў фондах НПГКМЗ [21]. Яна ўяўляе сабой невялікі гаршчок, да якога прымацаваны носік. Па тэхналогіі, для атрымання гуку трэба было наліць вады ўнутр і пры падачы паветра праз носік атрымлівалася прыгожае пералівістае гучанне.

Найбольшая колькасць гліняных свісцёлак у Полацку была знойдзена падчас раскопак Н.І. Здановіч і С.В. Тарасава на Вялікім пасадзе [3, с. 143]. Частка цацак была выяўлена ў межах пабудовы першай паловы XVIII ст., іх знешняе афармленне, прапорцыі і тэматыка адрозніваюцца ад вядомых цацак з іншых гарадоў Беларусі [3, с. 143]. Таксама з Полацку паходзіць унікальная цацка – вершнік з рэалістычна выкананымі часткамі адзежы. Яе абрысы падкрэслены ангобным роспісам. Для Полацкіх цацак характэрны ангобны роспіс, які прыдае свістулькам дэкаратыўны характар. Свістулькі маглі быць пакрыты палівамі карычневага і зялёнага колеру па ангобу [3, с. 143].

Значная колькасць керамічных свістулек паходзіць з тэрыторыі Экіманьскага пасада. Так, падчас раскопак Д.У. Дука ў 2009 г. тут выяўлена чатыры свістулькі (тры ў шурфе 3 і адна ў шурфе 4) [7, с. 103]. Таксама, тут знойдзены шэраг цацак як пад'ёмны матэрыял: на агародах мясцовых жыхароў. Па пісьмовых крыніцах і вусных сведчаннях вядома, што Экімань з'яўлялася цэнтрам ганчарнай вытворчасці ў XVI – 1-й пал. XX стст. [15, с. 38; 17, с. 474]. Тут шырока выраблялiся, у тым ліку, і керамічныя свістулькі (пераважная большасць – конікі).

У 2020 г. Полацкім цэнтрам рамёстваў і нацыянальнай культуры быў падрыхтаваны праект рэканструкцыі вырабу полацкіх гліняных свістулек. Па выніках дадзенай працы працэс стварэння свістулек быў унесены ў спіс нематэрыяльных культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Рашэнне Рады ад 14.10.2020 г. № 04-01-02/8 было зацверджана Міністэрствам культуры 22.10.2020 г. пад № 75 і вызначана як унікальная з'ява «Традыцыйныя вобразы гліняных народных цацак Аршанскага Падняпроўя і Віцебскага Падзвіння і тэхналогія іх вырабу», куды ўваходзяць і полацкія свістулькі [20].

**Заключэнне.** Такім чынам вызначана, што археалагічныя знаходкі музычных інструментаў у Полацку выяўлены ў вялікай колькасці. Яны прадстаўлены касцянымі свісцёлкамі, жалезнымі варганамі, бронзавымі бразготкамі, керамічнымі свістулькамі і інш. Дэталі струнных інструментаў прадстаўлены струнатрымальнікамі. Драўляных музычных інструментаў ці іх дэталей у культурных напластаваннях Полацка пакуль што не выяўлена.

Вельмі каштоўнай знаходкай з'яўляецца плінфа (старажытная цэгла) з выявай музыкаў. Папярэдне вызначана, што гэта маглі быць гусляры, якія трымаюць перад сабой крылападобныя гуслі без ігравога вакна. Полацкую знаходку можна датаваць 1-й пал. – сяр. XII ст. На аснове дадзенага артэфакта вызначана датаванне з'яўлення гусляў без ігравога вакна на тэрыторыі Усходняй Еўропы – не пазней першай паловы – сярэдзіны XII ст.

Асобнага даследавання патрабуе вывучэнне гліняных свістулек. У Полацку сфарміравалася свая асобная традыцыя вырабу цацак: гэта «конік» са спаранымі пярэднімі нагамі або на расстаўленых нагах з выцягнутай дугой шыяй. У 2020 г. працэс вырабу полацкіх свістулек быў унесены ў спіс нематэрыяльных культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Пэўных тэндэнцый у лакалізацыі археалагічных артэфактаў, звязаных з музычнай культурай, не прасочваецца. Знаходкі зафіксаваны ў розных частках Полацка і выяўлены як у межах заможных сядзібных комплексаў, так і характэрны для гарадскіх нізоў. Вялікая колькасць керамічных свістулек сведчыць аб шырокім попыце на дадзеныя прадметы. Як адно з месцаў іх вытворчасці можна вызначыць Экіманьскі пасада, што быў цэнтрам вырабу керамікі XVIII – пач. XX стст.

## ЛІТАРАТУРА


1. Войтехович, А.В. Погребальный обряд населения Полоцкой земли в X – XII вв. / А.В. Войтехович. – Минск : Беларуская навука, 2019. – 269 с.
2. Гуревич, Ф.Д. Изображение музыкантов Древней Руси / Ф.Д. Гуревич // Советская археология. – 1965. – № 2. – С. 278–280.
3. Дук, Д.У. Полацк XVI – XVIII стст: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д.У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2007. – 268 с.
4. Дук, Д.У. Рэчавы комплекс з раскопак на Запалоцкім пасадзе старажытнага Полацка ў 2004 і 2006 гадах / Д.У. Дук // Acta archaeologica Albaruthenica. – Мінск : І.П. Логвінаў, 2009. – Vol. V (Вып. 5) / Уклад. М.А. Плавінскі, В.М. Сідаровіч. – С. 19–45.
5. Дук, Д.У. Справаздача аб археалагічных раскопках на тэрыторыі Ніжняга замка г. Полацка ў 2014 г. / Д.У. Дук // Архіў ІГНАНБ. Воп. 1. № 3308.
6. Дук, Д.В. Отчёт об археологических исследованиях на территории Полоцкого Спасо-Евфросиньевского монастыря г. Полоцке в 2017 г. Ч. 1. / Д.В. Дук, А.Л. Коц, Е.Н. Торшин, П.Л. Зыков, О.А. Емельянчик, И.В. Магалинский // Архив ИИНАНБ. Дело № 3327а.
7. Дук, Д.У. Экімань у сацыятапаграфічнай структуры Полацка XV – XVIII стст. / Д.У. Дук // МАБ. – 2011. – № 21. – С. 99–114.
8. Калечыц, І.Л. Эпіграфіка Беларусі X – XIV стст. / І.Л. Калечыц. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 271 с.
9. Коц, А.Л. Навуковая справаздача аб правядзенні археалагічных раскопак на тэрыторыі Верхняга замка і Запалоцкага пасада г. Полацка ў 2016 г. Ч. 1. / А.Л. Коц // Архіў ІГНАНБ. Воп. 1. Знаходзіцца на зацвярджэнні ў павлявым камітэце.
10. Коц, А.Л. Справаздача аб археалагічных раскопках на тэрыторыі Запалоцкага пасада г. Полацка ў 2015 г. / А.Л. Коц // Архіў ІГНАНБ. Воп. 1. № № 3343.
11. Коц, А.Л. Ювелірная майстэрня XII ст. на Запалоцкім пасадзе старажытнага Полацка (па матэрыялах археалагічных раскопак 2013 г.) / А.Л. Коц // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитаные науки. – 2015. – № 1. – С. 18–27.
12. Мядзведзева, В.У. Касцярэзная вытворчасць Полацкай зямлі IX – XIII стст. / В.У. Мядзведзева. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – 236 с.
13. Поветкин, В.И. Музыкальные древности Новгорода / В.И. Поветкин // Новгородские археологические чтения : материалы науч. конф., посвящ. 60-летию археологического изучения Новгорода и 90-летию со дня рождения основателя Новгородской Археологической экспедиции А.В. Арциховского. – Новгород,1994. – С. 67–74.
14. Салаўёў, А.А. Полацкая цацка XVII – XVIII стагоддзяў / А.А. Салаўёў // Мастацтва. – 2002. – № 5 – 6. – С. 50–52.
15. Соловьёв А.А. К вопросу о реконструкции исторической топографии Экимани / А.А. Соловьёв // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитарные науки. – 2013. – № 9. – С. 29–39.
16. Сарабьянов, В.Д. Спасо-Преображенская церковь Евфросиньева монастыря и её фрески / В.Д. Сарабьянов. – М. : «Северный паломник», 2009. – 220 с.
17. Шидловский, С.О. Инвентарная опись имения Экимания (1846–1848) как источник для изучения хозяйственной культуры дворянства Полотчины 40-ых гг. XIX в. [Электронный ресурс] / С. О. Шидловский // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. арт. IV міжнар. навук. канф., Полацк, 19–20 красав. 2018 г. / Пад агул. рэд. А.І. Корсак. – Наваполацк : ПДУ, 2018. – 1 элек. аптыч дыск (CD-R). – С. 470–540.
18. Ярмохін, М.В. Дэндрахраналагічнае датаванне будаўніцтва Полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы / М.В. Ярмохін, А. Вітас, І.Л. Калечыц // Беларускі гістарычны часопіс. – 2016. – № 8. – С. 13–17.
19. Jazdzewski, K. Kilka uzupelnajachich uw ag o geslach gdanskich / K. Jazdzewski // ZOW. – 1950. – С. 102–104.

20. Дзяржаўная установа “Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://omcnt.by/tradyczyjnyya-vobrazy-i-tehnalogiya-vyrabu-glinyanyh-narodnyh-czaczak-arshanskaga-padnyapro%d1%9eya-i-viczebskaga-padzvinnya/. – Дата доступу: 20.12.2021
21. Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://polotsk.museum.by/node/48555#&gid=1&pid=2. – Дата доступу: 20.12.2021.

*Пастуніў 30.12.2021*

## МУЗЫКАЛЬНАЯ КУЛЬТУРА ПОЛАЦКА XI – XIX ВВ. (ПО МАТЕРИАЛАМ АРХЕОЛОГИЧЕСКИХ РАСКОПОК)

***А.Л. КОЦ***

*Древняя музыкальная культура Полоцка – тема, которая не исследована в отечественной науке. Целенаправленных археологических исслдеований в обозначенной области практически нет. Количество археологических находок, которые подтверждают распространение музыкальных инструментов, достаточно велико. Также найдены артефакты с изображением музыкантов. Уникальной находкой является фрагмент древнего кирпича (плинфы) с изображением музыкантов, вероятно гусляров. Изображение не только даёт информацию о музыкальных инструментах, но и о ряде деталей: одежда, обувь, композиционное размещение, иконография и стиль изображения и т.д. Артефакты XVI – XIX вв. также найдены в большом количестве. Наибольшая часть находок представлена керамическими свистульками. В 2020 г. возрождённая традиция изготовления свистулек была внесена в список нематериальных культурных ценностей Республики Беларусь.*

***Ключевые слова:*** *Полоцк, археологические исследования, музыкальная культура, музыкальный инструмент, гусли, плинфа.*

## MUSICAL CULTURE OF POLATSK XI – XIX CENTURIES. (BASED ON MATERIALS FROM ARCHAEOLOGICAL EXCAVATIONS)

***A. KOTS***

*The ancient musical culture of Polotsk is a topic that has not been studied in domestic science. There is practically no purposeful archaeological research in the designated area. The number of archaeological finds that confirm the spread of musical instruments is quite large. In the cultural layer of Polotsk XI – XIII centuries. found at least. A unique find is a fragment of an ancient brick (plinths) depicting musicians, probably guslars. The image not only provides information about musical instruments, but also about a number of details: clothing, shoes, compositional placement, iconography and style of the image, etc. Artifacts of the 16th – 19th centuries also found in large numbers. Most of the finds are represented by ceramic whistles. In 2020, the revived tradition of making whistles was included in the list of intangible cultural values of the Republic of Belarus.*

***Keywords:*** *Polotsk, archaeological research, musical culture, musical instrument, psaltery, plinth.*